Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 250 (319) НЯДЗЕЛЯ 27 КАСТРЫЧНІКА 1940 г.

Цана 10 капеек.

28 кастрычніка спаўняецца год з дня адкрыцця Народнага Сабрання Заходняй Беларусі.

Працоўныя Беластоцкай абласці шлюць правадыру народаў вялікаму Сталіну шчырую падзяку за вызваленне іх гераічнай Чырвонай Арміяй ад капіталістычнай эксплаатацыі і нацыянальнага прыгнечання.

АЖЫЦЦЁЎЛЕНАЯ ВОЛЯ НАРОДА

28—30 кастрычніка 1939 года—гэта гістарычныя дні пасяджэнняў Народнага Сабрання Заходняй Беларусі. 927 дэпутатаў, выбраныя вызваленым народам на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні, выканалі волю народа: аднагалосна вырашылі гістарычныя пытанні аб дзяржаўнай уладзе, уваходжанні Заходняй Беларусі ў састаў БССР, канфіскацыі памешчыцкіх зямель і нацыяналізацыі банкаў і буйнай прамысловасці.

Гэтыя дні былі днямі таржаства і лікавання ўсіх працоўных, вызваленых з ярма капіталістаў і пемешчыкаў, ад нацыянальнага прыгнечання. Мільёны працаўнікоў гарадоў і вёсак, чые здзейсніліся многагадовыя спадзяванні—жыць пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі,—дэманстрыравалі сваю глыбокую ўдзячнасць совецкаму ўраду, большэвіцкай партыі, правадыру народаў усяго свету вялікаму Сталіну. Вызвалены народ патрабаваў ад сваіх прадстаўнікоў, пасланых ім у Народнае Сабранне, аднаго: галасаваць за з'еднанне Заходняй Беларусі з Совецкай Соцыялістычнай Беларуссю і за ўваходжанне ў састаў вялікага Совецкага Саюза.

Воля народа была выканана.

«Народнае Сабранне, выражаючы непахісную волю і жаданні народаў Заходняй Беларусі, праўзглашае на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі ўстанаўленне совецкай улады. Ад гэтага часу ўся ўлада на тэрыторыі Заходняй Беларусі належыць працоўным горада і вёскі ў асобе Советаў дэпутатаў працоўных»,—запісала Народнае Сабранне ў аднагалосна прынятай дэкларацыі аб дзяржаўнай уладзе.

«Працоўныя Заходняй Беларусі заўсёды лічылі сябе звязанымі непарыўнымі кроўнымі сувязямі з сваімі братамі, якія пабудавалі соцыялістычную Совецкую Беларусь. Працоўныя Заходняй Беларусі рашуча патрабуюць з'еднання да гэтага часу расшчэпленых двух частак адзінага беларускага народа адзінай беларускай зямлі»,—выразіла волю працоўных Народнае Сабранне.

Народнае Сабранне вызначыла далейшае развіццё вызваленых народаў, як развіццё па шляху соцыялістычнага будаўніцтва.

«Ад гэтага часу ўся зямля Заходняй Беларусі з яе нетрамі, лясы і воды аб'яўляюцца агульнанародным здабыткам, гэта значыць дзяржаўнай уласнасцю».

Праўзгласіўшы нацыяналізацыю банкаў і буйнай прамысловасці, Народнае Сабранне гэтым самым вызначыла, што «ад гэтага часу працоўныя Заходняй Беларусі атрымліваюць у свае рукі магутныя сродкі свайго эканамічнага вызвалення—банкі і буйную прамысловасць. Тым самым створаны ўмовы для ўздыму народнай гаспадаркі, якая будзе забяспечана свабоднай працай рабочых, якія становяцца цяпер гаспадарамі фабрык і заводаў».

Народнае Сабранне заклікала ўсіх рабочых і служачых да рэволюцыйнай дысцыпліны, самаадданай працы ў інтарэсах канчатковай перамогі новага, соцыялістычнага ладу.

Гістарычныя рашэнні Беларускага Народнага Сабрання адкрылі новы, вышэйшы этап у жыцці народаў Заходняй Беларусі—этап разгорнутага соцыялістычнага будаўніцтва ў цесным брацкім супрацоўніцтве з народамі Совецкага Саюза.

Працоўныя Заходняй Беларусі свой творчы энтузіязм накіравалі на будаўніцтва соцыялізма. Мінуў год з дня прыняцця Народным Сабраннем Заходняй Беларусі гістарычных рашэнняў. За гэты час многае і многае зроблена. Ва ўсіх галінах гаспадаркі і культуры ёсць вялікія дасягненні. Але яшчэ многа і многа прадстаіць работы ўперадзе.

Рабочыя, сяляне і працоўная інтэлігенцыя, цесна згуртаваўшыся вакол партыі Леніна—Сталіна, вакол совецкага ўрада, ідуць на выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, каб выбраннем дастойных дэпутатаў яшчэ больш умацаваць органы совецкай улады, каб яшчэ хутчэй ісці па шляху будаўніцтва комунізма ў нашай краіне.

У дзень гадавіны Народнага Сабрання Заходняй Беларусі працоўныя нашай абласці пасылаюць палкае большэвіцкае прывітанне і ўдзячнасць за сваё вызваленне вялікаму совецкаму народу, комуністычнай партыі большэвікоў і правадыру, настаўніку і бацьку працоўных усяго свету вялікаму Сталіну.

ПАЧАТАК НОВАЙ ЭПОХІ

28 кастрычніка 1939 года з'яўляецца пачаткам новай эпохі ў гісторыі беларускага народа. У гэты дзень працоўныя нашай зямлі выказалі сваю жалезную волю ўстанавіць на тэрыторыі Заходняй Беларусі совецкую ўладу і з'еднацца з вялікай краінай соцыялізма.

Калі з трыбуны Народнага Сабрання мне прышлося рабіць даклад аб тым, якой павінна быць улада на нашай вызваленай зямлі, я іранічна запытаў дэпутатаў народа:

— Можа быць, зноў запросім бэкаў і рыдз-сміглаў?

Тады ў зале ўзнялася хваля абурэння—увесь зал крычаў:

— Далоў эксплаататараў і прыгнятальнікаў! Далоў белага арла з крывавымі кіпцюрамі! Няхай жыве наша родная, любімая совецкая ўлада! Патрабуем з'еднання з роднай БССР і ўсім вялікім Совецкім Саюзам.

Гэтыя бурныя воклічы на беларускай, польскай, яўрэйскай мовах вырываліся проста з сэрцаў тэкстыльшчыкаў Беластоку, батракоў Навагрудчыны, сялян Палесся, настаўнікаў, паэтаў, мастакоў — многапакутных народаў Заходняй Беларусі якія скінулі з сябе капіталістычныя пяўкі.

Пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і вялікага Сталіна, пры брацкай дапамозе народаў Совецкага Саюза працоўныя Заходняй Беларусі гіганцкі крочаць уперад па шляху соцыялістычнага будаўніцтва. Дасягненні гэтага года гавораць самі за сябе. І гэтых дасягненняў вызвалены народ не аддасць нікому і ніколі.

С. О. Прытыцкі,
Дэпутат Вярхоўнага Совета СССР, намеснік старшыні Беластоцкага аблвыканкома.

Хвалюючыя дні

Было гэта ў кастрычніку 1939 года.

Уся ўвага працоўных была сканцэнтрыравана на прадстаячым Народным Сабранні. І мне рабочыя аказалі вялікае давер'е, абраўшы сваім прадстаўніком у Народнае Сабранне.

28 кастрычніка раніцой усе дэпутаты сабраліся ў гарадскім тэатры.

Пасяджэнне Народнага Сабрання адкрывае старэйшы дэпутат селянін тав. Струг. Як толькі ён сказаў — «Народнае Сабранне Заходняй Беларусі адкрыта»—па залу пракацілася магутная хваля воклічаў: «Сталіну ўра!»

Назабываемая радасць гарачай хваляй ахапіла сэрца кожнага. Воклічы і воплескі не змаўкалі.

Гэтага мы чакалі. За гэты дзень, за гэту гадзіну змагаліся дзесяткі і сотні тысяч рабочых і сялян.

Затым гаварыў тав. Прытыцкі. Калі ён паставіў пытанне:

—Можа хто згодны папрасіць паноў, каб яны вярнуліся да нас...

Яму не далі акончыць апошніх слоў. Усе ўзняліся з месца, і на ўвесь зал прагрымела: «Не, ніколі! Мы жадаем толькі совецкай улады!»

З такім-жа захапленнем была сустрэты зачытаныя дэкларацыі аб утварэнні совецкай улады і з'еднанні нашай зямлі з краінай Советаў, аб нацыяналізацыі прадпрыемстваў, банкаў, зямель.


Затым прышлі нас вітаць дзеці, совецкія дзеці, якіх мы ўпершыню бачылі. Хлопчык і дзяўчаткі гралі на скрыпцы, а астатнія дзеці цудоўна танцавалі.

Пасля дэпутаты Народнага Сабрання паехалі глядзець парад і дэманстрацыю працоўных. Нашы вочы не маглі адарвацца ад магутных танкаў, ад стальных чырвоназвездных птушак. Мы ведалі: у краіне соцыялізма мы можам мірна працаваць, бо нас абараняе несакрушымая сіла Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Прайшоў год плаДатворнай працы. Замест дробных прадпрыемстваў у нас выраслі буйныя камбінаты. Я многаму за гэты год навучылася. Мяне рабочыя выбралі членам абкома саюза шарсцянікаў. Я адказваю за жыллёва-бытавую работу. Магу сказаць, што і ў гэтым напрамку ў нас ёсць поспехі. Нашы дзеці, дзеці беластоцкіх тэкстыльшчыкаў, ужо адчуваюць чулыя клопаты з боку Совецкай краіны. Арганізаваны дзіцячыя яслі на плюшавай фабрыцы, на 1-м, 5-м камбінатах, на 29-й і іншых фабрыках. Ёсць рад фабрычных дзіцячых садоў. Але гэта толькі пачатак. З кожным месяцам, з кожным годам у нас жыццё будзе лепшым, святлейшым.

Ад вытворчасці я не адарвалася. Я працую вінтаўшчыцай на 3-м камбінаце. Уся наша брыгада прымае актыўны ўдзел у соцыялістычным спаборніцтве ў чэсць XXIII гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі і выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Софія Зеленкевіч.



Збыліся жаданні працоўнага сялянства

Сям'я вялікая, пракарміць яе трэба, а зямлі адзін загончык. Хлеба толькі хапала на чатыры—пяць месяцаў у годзе. Думка аб зямлі не выходзіла з галавы.

Побач з нашай вёскай жыў памешчык. Уся лепшая зямля, пасбішчы, лес належалі яму. Бednякі нашай вёскі былі пастаяннымі работнікамі ў гэтага памешчыка.

Мая мара аб зямлі збылася ў верасні 1939 года. Чырвоная Армія прынесла нам шчасце, прагнала назаўсёды гэтых праклятых эксплаататараў. Калі мы выбіралі дэпутатаў у Народнае Сабранне, мы далі ім наказ, каб яны галасавалі за совецкую ўладу, за канфіскацыю памешчыцкай зямлі, за перадачу яе сялянам. Волю народа яны выканалі.

На ўсё жыццё астаўся ў маёй памяці гістарычны дзень 28 кастрычніка 1939 года, калі засядала Народнае Сабранне, якое рашыла канфіскаваць памешчыцкую зямлю і перадаць яе беззямельным і малазямельным сялянам. Тады-ж я атрымаў зямлю, аб якой дзесяткі год марыў. Атрымалі таксама зямлю мае суседзі: Антон Пулькоўскі, Францішак Крыштофер, Казімір Мужчынскі і іншыя.

— Вялікае дзякуй дарагому правадыру таварышу Сталіну за тое, што ён паклапаціўся аб нас і вызваліў ад прыгнёту памешчыкаў і капіталістаў.

Эдуард Мужчынскі,
селянін вёскі Залесяны, Беластоцкага раёна.

Пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі

28—30 кастрычніка 1939 года вызваленыя гераічнай Чырвонай Арміяй народы Заходняй Беларусі ў асобе сваіх прадстаўнікоў—дэлегатаў Народнага Сабрання — вырашылі асноўныя пытанні свайго жыцця. Установлена совецкая ўлада, канфіскавана зямля памешчыкаў, манастыроў, буйных дзяржаўных чыноўнікаў, нацыяналізаваны банкі і буйная прамысловасць. Усё, што створана рукамі працоўных і было прысвоена кучкай эксплаататараў, стала ўсенародным здабыткам, уласнасцю соцыялістычнай дзяржавы.

Мінуў толькі адзін год. А якія вялікія вынікі дзякуючы сваёй гераічнай працы атрымаў вызвалены народ!

Няма ні адной галіны народнай гаспадаркі і культуры, дзе-б народы не бачылі найвялікшых змяненняў і выдатных дасягненняў у справе соцыялістычнага будаўніцтва.

Выключна хутка растуць у нас людзі з вытворчасці, вылучаныя на камандныя, адказныя пасады. Яны хутка асвоілі даручаную ім работу і паспяхова спраўляюцца з сваімі задачамі. Па беластоцкаму тэкстыльнаму трэсту вылучана 1.040 чалавек. З іх на пасады майстраў—130 чалавек, начальнікамі цэхаў—50 і на іншыя гаспадарчыя пасады—565 чалавек. На Беластоцкай чыгунцы вылучана на розныя камандныя пасады 578 чалавек. Усяго па абласці вылучана з мясцовага актыва на кіруючыя пасты—11.598 чалавек, у тым ліку беларусаў—3.214 чалавек, рускіх—613, палякаў — 5.195, яўрэяў—2.414 і іншых нацыянальнасцей—145 чалавек.

Вылучэнне кадраў з мясцовага насельніцтва за апошні час яшчэ больш павялічылася як у гарадах, так і ў сельскіх мясцовасцях абласці.

Былыя бяспраўныя рабочыя сталі начальнікамі цэхаў, дырэктарамі заводаў, фабрык. Сяляне ўзначальваюць работу ў калгасах. Лепшыя з іх, верныя сыны і дочкі народа, будуць пасланы ў мясцовыя органы ўлады.

Сотні і тысячы людзей на фабрыках, заводах, у маладых калгасах сваёй адданай работай паказваюць, на якія творчыя подвігі здолен народ, калі ён ведае, што працуе не на эксплаататараў-памешчыкаў, а на сябе, на сваю родную совецкую дзяржаву.

Гэту творчую працу можна наглядна прадэманстрыраваць на будаўніцтве Днепра-Бугскага канала. Тое, чаго польскі ўрад не мог вырашыць за два дзесяцігоддзі, совецкая ўлада вырашыла за 6—7 месяцаў. Абшырная водная магістраль — Днепра-Бугскі канал—працятам больш 200 кілометраў здадзен у эксплаатацыю.

Вялікія змяненні адбыліся ў сельскай гаспадарцы вызваленай Заходняй Беларусі. Больш 440 тысяч гектараў зямлі атрымалі ў свае карыстанне батракі і бяднейшае сялянства. На дапамогу працоўным сялянам прышла передавая тэхніка. Створана 101 МТС.

Заходняя Беларусь да з'еднання ў прамысловым развіцці стаяла ніжэй у 9 разоў, чым БССР. Соцыялістычная сістэма гаспадаркі за адзін год зусім змяніла твар прамысловасці. Прадпрыемствы расшыраны, тэхнічна аснашчоны, механізаваны і вышлі з застою.

За адзін год створаны новыя прадпрыемствы мясцовай будаўнічай, керамічнай, лесаапрацоўваючай і іншых галін прамысловасці. Аб'ём валавой прадукцыі ў параўнанні з 1938 годам павялічыўся на 195,7 процанта. Здабыча торфу ўзрасла ў многа разоў. Выпуск шарсцяных тканін павялічыўся на 169,2 процанта, абутку—на 243,5 процанта, запалак—на 351,4 процанта.

Выпуск веласіпедаў на рэканструіраваным гродненскім заводзе павялічыўся ў два разы. Створаны новыя прадпрыемствы харчовай прамысловасці. Магутнасць аднаго толькі хлебазавода ў Беластоку складае больш 50 тон, працуе больш 90 хлебапякарань.

Тэхнічна пераўзбройваецца і, па сутнасці, занава ствараецца тэкстыльная прамысловасць. Беласток ператвараецца ў буйны прамысловы цэнтр Саюза. Ужо створаны 32 буйных тэкстыльных прадпрыемствы. На рэканструкцыю іх выдаткоўваецца 56 мільёнаў рублёў. Пры панаванні капіталістаў тэкстыльная прамысловасць Беластока давала 5—6 мільёнаў метраў тканіны ў год. У гэтым годзе яна ўжо дае к канцу года 13 мільёнаў метраў, а ў 1941 годзе дасць 15—16 мільёнаў метраў.

Пачын беластоцкіх тэкстыльшчыкаў, высунуўшых лозунг ператварэння Беластока ў другое Іванава, з'яўляецца выражэннем далучэння шырокіх народных мас былой Заходняй Беларусі да будаўніцтва соцыялізма.

Гэты соцыялістычны рух даў магчымасць тэкстыльшчыкам Беластока выканаць поўгадавы план на 102,6 процанта. Цяпер, рыхтуючыся да XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі і да дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, тэкстыльшчыкі абавязаліся выканаць гадавы план да 15 снежня 1940 года.

Культура народа ў панскай Польшчы была ў поўным занядпадзе. Польскія памешчыкі і капіталісты прымушалі беларусаў «думаць папольску» і як мага хутчэй «перамагчы старажытную беларускую культуру». Паны дабіліся таго, што на тэрыторыі беларускіх абласцей не стала ні адной беларускай школы. У выніку большасць беларускага сялянства было непісьменным.

Зусім іншае мы маем зараз пры совецкай уладзе. У 1939—40 гг. адкрыта ў Заходняй Беларусі 1.288 новых школ, 4 інстытуты, 8 педвучылішчаў. Выкладанне ў школах вядзецца на роднай мове. У Беластоцкай абласці адкрыта 178 новых школ, а колькасць вучняў у школах павялічылася на 30 тысяч чалавек.

Раней на тэрыторыі Заходняй Беларусі не было ні аднаго пастаяннага тэатра, цяпер іх—6. Створаны філармонія, сімфанічны аркестр, ансамбль песні і пляскі. Адкрыта два музыкальных тэхнікумы, 8 музыкальных вучылішчаў, 4 студыі мастацтваў, 8 музеяў, 80 масавых бібліятэк, сотні дамоў соцыялістычнай культуры і хат-чытальнь.

Совецкая ўлада асігнавала вялікія сумы на ахову здароўя. Па ўсёй абласці ўведзена бясплатнае абслугоўванне працоўных. Значна пашырана сетка лячэбных установ, колькасць больніц падвоілася.

Усе гэтыя поспехі дасягнуты дзякуючы дапамозе народаў Совецкага Саюза, пры непасрэдным кіраўніцтве большэвіцкай партыі, совецкага ўрада і любімага друга ўсіх працоўных вялікага Сталіна.

15 кастрычніка гэтага года пачалася кампанія па выбарах у абласныя, гарадскія, раённыя, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных у заходніх абласцях Украінскай і Беларускай ССР і ў Карэла-Фінскай ССР.

Партыйныя, совецкія і грамадскія арганізацыі ўжо разгарнулі вялікую арганізацыйную і прапагандысцкую работу.

Працоўныя паслалі ў выбарчыя камісіі сваіх лепшых прадстаўнікоў, знатных людзей: Пісьменніка Ф. Пестрака, старшыню калгаса тав. Масімюк, памочніка машыніста дэпо станцыі Беласток тав. Партынскага і інш.

У акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах у абласны Совет вылучана 848 чалавек, у раённыя Советы—7.636, гарадскія—7.631, сельскія і пасялковыя 27.253.

Ва ўчастковыя выбарчыя камісіі вылучана 6.720 чалавек. Усяго ў выбарчых камісіях пачынаюць работу 60.738 чалавек.

Не меншы лік патрабуецца і агітатараў на выбарчых участках. Па гораду Беластоку падабрана ўжо каля 3 тысяч агітатараў. 1.800 агітатараў працуюць сярод насельніцтва, а астатнія займаюцца на трохдзённых курсах. 370 агітатараў працуюць сярод польскага насельніцтва і 212—сярод яўрэйскага.

У агітацыйнай рабоце неабходна выкарыстаць усе формы і метады, якія прымяняліся ў выбарчай кампаніі па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Каб ахапіць пагалоўна ўсіх выбаршчыкаў, мы павінны арганізаваць гурткі, лекцыі, даклады, праводзіць групавыя і індывідуальныя кансультацыі, выкарыстаць наш насценны друк, кіно, радыё, арганізаваць вечары пытанняў і адказаў.

Цэнтрам работы павінен быць выбарчы ўчастак. Трэба зараз-жа арганізаваць сярод усіх слаёў працоўных вывучэнне Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Уся наша агітацыйная работа павінна быць мэтанакіраванай, ідэйназмястоўнай і даходлівай да шырокіх мас выбаршчыкаў.

Улічваючы, што выбарчая кампанія супала з падрыхтоўкай да правядзення XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, неабходна ўсю агітацыйную работу спалучаць з праведзеннем святкавання гэтай знамянальнай гістарычнай даты.

Ва ўсёй нашай рабоце неабходна асаблівае павышэнне класавай рэволюцыйнай пільнасці.

Трэба заўсёды памятаць указанні таварыша Сталіна аб капіталістычным акружэнні. Ворагі працоўных, ворагі рабочага класа будуць перашкаджаць нам у гэтай важнейшай палітычнай кампаніі. Таму мабілізацыя працоўных, згуртаванне іх вакол большэвіцкай партыі і совецкага ўрада з'яўляецца залогам поспеху выбараў.

Дэпутатамі павінны быць выбраны самыя актыўныя барацьбіты за шчасце працоўных, якія зарэкамендавалі сябе ў годы барацьбы з ненавіснымі прыгнятальнікамі і ў творчай працы пры совецкай уладзе.

У Советы трэба паслаць актыўных працаздольных людзей, чэсных і праверaных, для якіх інтарэсы радзімы вышэй усяго на свеце.

Таму самым адказным этапам выбарчай кампаніі з'яўляецца вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты і перадвыбарчая агітацыя.

Працоўныя нашай абласці ўжо дэманстрыравалі сваё адзінства, сваю адданасць вялікай партыі Леніна—Сталіна ў час выбараў дэпутатаў у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі, у час выбараў дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. У выбарах у Вярхоўныя Советы прыняла ўдзел 98,6 процанта ўсіх выбаршчыкаў, 98 процантаў з іх аддалі свае галасы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных. Няма сумнення, што на выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных рабочыя, сяляне і працоўная інтэлігенцыя нашай абласці яшчэ раз прадэманструюць адзінства, згуртаванасць вакол партыі Леніна—Сталіна, аддадуць свае галасы за лепшых сыноў і дачок народа.

Г. Сямёнаў.
сакратар беластоцкага абкома КП(б)Б.

Будзем працаваць яшчэ лепш на дабро і магутнасць нашай сацыялістычнай радзімы

Факты і лічбы

24, 25 і 27 лістапада 1939 года Часовае ўпраўленне Беластоцкай вобласці пастанавіла (згодна дэкларацыі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі ад 28 кастрычніка 1939 года аб нацыяналізацыі банкаў і буйнай прамысловасці) нацыяналізаваць на тэрыторыі Беластоцкай вобласці ўсе прадпрыемствы тэкстыльнай, паліграфічнай, лясной, харчовай і скураной прамысловасцей.

* * *

У горадзе Беластоку было 97 дробных тэкстыльных фабрык, у якіх працавала ў лепшыя годы да 5 тысяч рабочых. Прадукцыя Беластоцкай тэкстыльнай прамысловасці дасягала пяці мільёнаў метраў сукна ў год. Пасля нацыяналізацыі тэкстыльных прадпрыемстваў з іх было створана 28 буйных камбінатаў і фабрык з 11 тысячамі рабочых і з гадавым выпускам прадукцыі звыш дзесяці мільёнаў метраў высокаякаснай тканіны. Фабрыкі рэканструіраваны. Будуецца новая буйная баваўняна-прадзільная фабрыка.

З 16 нацыяналізаваных дробных скураных заводаў, якія існавалі ў Беластоку, створана пасля нацыяналізацыі два буйныя скурзаводы, якія таксама рэканструіруюцца.

Уступіла ў строй табачная фабрыка, знішчаная польскімі правіцелямі. Будуецца хлебазавод, халадзільнік і рад іншых прадпрыемстваў. Саматужныя майстэрні аб'яднаны ў буйныя арцелі. Беспрацоўе ліквідавана, і зараз у Беластоку адчуваецца ўжо недахоп рабочай сілы.

* * *

6.357 гектараў панскай зямлі перайшло ў Гродненскім раёне ў рукі 2.500 беднейшых сялянскіх сем'яў. У раёне арганізавана 28 калгасаў, два соўгасы, МТС.

Нацыяналізаваныя фабрыкі і заводы горада Гродна працуюць на поўную тэхнічную магутнасць. Колькасць рабочых у Гродне ўзрасла з 1.815 чалавек да 5.500. Пушчаны ў ход прадпрыемствы, якія раней доўгі час стаялі, будуюцца новыя прадпрыемствы.

Разгрузка і пагрузка вагонаў на станцыі Гродна павялічылася за год у 5 разоў.

* * *

Працоўнае сялянства Ломжынскага раёна атрымала ад савецкай улады 2.242 гектары зямлі, якой раней валодалі памешчыкі. Беднякі атрымалі 237 коней, 425 кароў, шмат дробнай жывёлы і сельскагаспадарчага інвентару. Пацярпеўшым ад ваенных дзеянняў у час польска-германскай вайны роздана 4.300 кубаметраў лесу, адпушчана збожжа і бульба на вясеннюю сяўбу.

Арганізавана МТС, якая аказвае велізарную дапамогу бядняцкім гаспадаркам. Створан калгас імені Фелікса Дзяржынскага. Калгаснікі атрымаюць на працадзень па 6—7 кілаграмаў збожжавых і іншыя прадукты.

Нацыяналізаваныя прадпрыемствы працуюць поўным ходам. Пушчан піўны завод у Драздове, які стаяў на працягу 8-і год, адбудаван цагельны завод у Цыдзіне, механічны млын у Шчэпанкове, кузнечна-слясарная майстэрня ў Рогеніцы. Вырас новы від прамысловасці — торфаздабыча.

* * *

У Аўгустоўскім раёне падзелена паміж беззямельнымі і малазямельнымі сялянамі 2.279 гектараў зямлі, 219 коней, 283 галавы буйнай рагатай жывёлы, 500 тысяч кубаметраў лесу. У раёне арганізавалася 9 калгасаў.

У Аўгустове нацыяналізавана 12 прадпрыемстваў. Пушчан у ход стаяўшы на працягу 13 год скурзавод.

* * *

Працоўныя сяляне Бельскага раёна атрымалі 4.543 гектары памешчыцкай зямлі. 144 беднякі атрымалі коней, 324— кароў.

У раёне арганізавалася 6 калгасаў, якія аб'ядноўваюць 430 гаспадарак. У выніку дружнай работы калгаснікі атрымаюць за працадзень па 5—10 кілаграмаў збожжа, па 8—12 кілаграмаў бульбы, многа кармоў і грошай. У раёне створана МТС.

У час польскай улады ў раёне працавалі толькі дробныя саматужныя прадпрыемствы, а беспрацоўных было 1.658 чалавек. Зараз беспрацоўе ліквідавана. У раёне працуе ў пяць разоў рабочых больш, чым раней — каля 2-х тысяч чалавек. Створаны буйныя прадпрыемствы: кафельны завод № 13, які налічвае 150 рабочых, шавецкая арцель, дзе працуе 105 чалавек, і інш.

* * *

Савецкая ўлада дала працоўным сялянам Саколкаўскага раёна 1.954 гектары зямлі, 219 коней, 261 карову, 141 авечку, вялікую колькасць маладняка і рознага сельскагаспадарчага інвентару.

Беспрацоўе ліквідавана поўнасцю. Лік працуючых узрос у тры разы. Праведзен капітальны рамонт скурзавода, адрамантаван і пушчан лесапільны завод: дробныя саматужныя прадпрыемствы злучаны ў арцелі.

Штрыхі новага

На першым гарадскім злёце многастаночнікаў сярод шматлікіх выступленняў перадавікоў сацыялістычнай вытворчасці асабліва ярка прагучэла прамова стаханаўкі 1-га тэкстыльнага камбіната тав. Жыўлюк. Яна гаварыла коратка, але змястоўна. Прамова яе зводзілася к таму, што калі-б пры панаванні капіталіста ёй заплацілі за работу на многа больш, яна ні за што не згадзілася-б перайсці на ўшчыльненую зону абслугоўвання.

Праца на сябе, на сваю сацыялістычную радзіму — вось што натхняе стаханаўца, новага чалавека савецкага часу, глыбока ўсведамляючага сваю ролю ў прамысловасці.

З той пары, як капіталістычныя прадпрыемствы воляй Народнага Сабрання сталі здабыткам народа, прайшоў год.

За гэты час маленькія фабрыкі з паламаным абсталяваннем ператвараюцца ў прадпрыемствы новага тыпу, дзе тэхналагічны працэс і арганізацыя працы садзейнічаюць росту прадукцыйнасці працы, павышэнню новай вытворчай культуры.

* * *

Аб табачнай фабрыцы — прадпрыемстве, па сутнасці, абноўленым за год існавання савецкай улады, можа расказаць любы рабочы Беластока. Гадамі стаяўшыя ў маўчанні цэхі ўпершыню загаварылі сталлю сваіх станкоў. Табачнікі Беластока, вымушаныя ў мінулым хадзіць у пошуках работы, як сапраўдныя гаспадары цяпер сталі ля складанейшага абсталявання.

Фабрыка ў корані змяніла свой воблік. У вялікіх, прасторных цэхах працуюць рабочыя. Усё тут нова, у тым ліку і станкі. Устаноўлены навейшыя машыны. Нядаўна работніцы фабрыкі пачалі пераходзіць на двухстаночнае абслугоўванне і ўжо выдзеліліся лепшыя стаханаўкі-двухстаночніцы тт. Берастаўіцкая, Штучка, Рагоўская і іншыя.

Днямі ўступаюць у строй складаныя машыны савецкай вытворчасці. Тут будуць працаваць друкарнапачачныя і ўкладачныя машыны. Пад кіраўніцтвам вынаходніка гэтых машын тав. Мільнера работніцы табачнай фабрыкі асвоілі іх. Штодзённа фабрыка выпускае каля двух мільёнаў штук папярос. Неўзабаве выпуск іх дасягне трох з палавай мільёнаў штук у дзень.

* * *

Там, дзе цяпер узвышаецца чатырохпавярховы корпус тэкстыльнага камбіната № 4, у мінулым была фабрыка Поляка. Непазнавальны зараз сталі цэхі. У жніўні быў поўнасцю адбудаван чацверты паверх. Абсталявана новае памяшканне пад апрэтурна-фарбавальны цэх, устаноўлены новыя машыны, сушыльны апарат.

Вялікая рэканструкцыйная работа стварыла ўсе ўмовы для далейшага павышэння прадукцыйнасці працы, павелічэння выпуску высокаякасных тканін. Аб размерах росту прадукцыйнасці працы можна меркаваць па такіх лічбах. Былая фабрыка Поляка выпускала ў сярэднім у месяц да 20 тысяч метраў тканін, 4-ы камбінат цяпер выпускае штомесячна ў сярэднім звыш 40 тысяч метраў тканін. Савецкая тканіна па сваёй якасці значна пераўышае тую, якая выпускалася на капіталістычнай фабрыцы.

Работа на сацыялістычным прадпрыемстве натхняе рабочых на высокапрадукцыйную стаханаўскую працу. З ліку старых ткачоў выраслі выдатныя энтузіясты сацыялістычнай працы. Узяць, напрыклад, тав. Плонскага. З месяца ў месяц ён перавыконвае сваё вытворчае заданне. Рыхтуючыся дастойна сустрэць слаўную XXIII гадавіну Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, тав. Плонскі ўзяў на сябе абавязацельства перайсці на абслугоўванне чатырох ткацкіх станкоў.

* * *

Да канцэнтрацыі абсталявання фабрыка № 24 была размешчана ў 6 розных памяшканнях. Пры такой раскіданасці многа сродкаў затрачвалася на транспартныя і адміністрацыйныя выдаткі. Не было правільнага тэхналагічнага патоку. Калектыў рабочых узяўся за аднаўленне свайго прадпрыемства. З ліку ткачоў былі састаўлены мантажныя брыгады. Рабочыя прынялі актыўны ўдзел у абмеркаванні тэхнічнага праекта рэканструкцыі. Некаторыя з іх унеслі рад каштоўных паправак у гэты праект. Так, сакратчыца тав. Дудзіч прапанавала склад для пражы будаваць не на 4-м, як гэта значылася ў праекце, а на 3-м паверсе. Тым самым была ліквідавана сустрэчная транспартыроўка. Указанне тав. Дудзіч праведзена ў жыццё.

* * *

Трэці паверх. Тут праводзіцца чарговы працэс па выпрацоўцы капяліна для шляп.

Фетра-фельцавая фабрыка ў Беластоку нарадзілася нядаўна. Аб такім прадпрыемстве калісьці думалі фабрыканты. Было завезена абсталяванне, але яно праляжала на складах звыш 20 год. І толькі цяпер, калі гаспадарамі краіны сталі працоўныя, фетра-фельцавая фабрыка ўступіла ў строй.

І. Давыдаў.

Партыйныя і беспартыйныя бальшавікі

У зварачны аддзел кацельнага цэха Лапскага паравоза-вагонарамонтнага завода прыйшоў агітатар комуніст Віталій Еўплоў. Новы агітатар, майстар зваркі, хутка заваяваў давер'е ў рабочых. Яго гутаркі заўсёды простыя і шчырыя.

Зваршчыкі дапускалі вялікі брак, і гэта згубна адбілася на вытворчасці ўсяго завода. Таму тав. Еўплоў чарговыя заняткі прысвяціў растлумачэнню Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 10 ліпеня аб барацьбе з бракам.

Зваршчыкі спрабавалі даказваць, што брак наогул немінуемая справа і яны тут не пры чым. Агітатар адкідваў тлумачэнні зваршчыкаў. Ён сеў за паяльнік і паказаў, як трэба рабіць зварку. І гэта дало свае вынікі. Цяпер зварачнае аддзяленне—суцэльна стаханаўскае, яго прадукцыя — высокаякасная. Па ініцыятыве стаханаўцаў Бартусевіча і Перкоўскага зваршчыкі спаборнічаюць паміж сабой за дастойную сустрэчу вялікай гадавіны Кастрычніка і выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных.

Комуніст Новікаў працуе агітатарам у кавальскім цэху. Заўсёды ў абедзены перапынак праводзіць агітатар ажыўленыя гутаркі з кавалямі. У сувязі з выбарчай кампаніяй тав. Новікаў падрабязна растлумачвае Сталінскую Канстытуцыю і Палажэнне аб выбарах. Ён не абыходзіць самых вострых, хвалюючых пытанняў.

У час сваёй гутаркі тав. Новікаў выявіў, што ў рабочага Акшынскага, які быў пераведзен сюды з другога цэха, чамусьці знізілі разрад. Агітатар запісаў гэта ў свой блакноце і абяцаў расследаваць. Ён гаварыў па гэтаму поваду з начальнікам цэха, але безрэзультатна. Тады тав. Новікаў пайшоў да начальніка завода і дабіўся свайго: рабочаму Акшынскаму ўстанавілі разрад, які быў незаконна зніжан.

Комуніст агітатар тав. Новікаў карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод сваіх слухачоў. Рабочыя ведаюць: хай гэта будуць складаныя пытанні міжнароднага становішча, або ўнутранай палітыкі Савецкага Саюза, або самыя будні жыццёвыя пытанні, — яны будуць вычарпальна растлумачаны агітатарам.

Для агітацыйна-палітычнай работы шырока працягваецца мясцовы актыў завода. Вялікай папулярнасцю на заводзе карыстаецца агітатар Франц Беганскі — брыгадзір бляхар. Само яго жыццё служыць цікавым матэрыялам для агітатара. 20 год ён працуе на гэтым заводзе. Ён удзельнічаў у забастоўках. Сумесна з перадавымі рабочымі завода змагаўся за справядлівае чалавечае жыццё.

На яго гутаркі прыходзяць рабочыя з другіх брыгад. З гордасцю адклікаюцца рабочыя аб сваім агітатару. Яны гардзяцца ім таму, што ён змог усіх іх падняць сваім палкім бальшавіцкім словам на вялікія справы. Брыгада Беганскага — стаханаўская. У апошнім месяцы яна выканала сваё вытворчае заданне на 300 процантаў.

Пачуцці калектыўнай адказнасці брыгады за кожнага рабочага і адказнасць кожнага рабочага за брыгаду ў цэлым — вось росткі новага, сацыялістычнага ў рабоце. На завод прыйшла без усякай кваліфікацыі маладая дзяўчына Ядвіга Закшэўская. Яна працавала прыбіральшчыцай у фарбавальным цэху. Агітатар-брыгадзір тав. Беганскі рашыў навучыць кваліфікацыі маладую работніцу. З яго дапамогай яна была пераведзена ў брыгаду бляхараў. Кожны рабочы гэтай брыгады лічыў сваім доўгам дапамагчы ёй у хутчэйшым асваенні новай прафесіі. За кароткі час Ядвіга авалодвала сваёй новай прафесіяй і стала стаханаўкай. На 170—180 процантаў выконвае яна цяпер сваё вытворчае заданне.

— У мяне ў брыгадзе ўсе стаханаўцы,—гаворыць з нескрываемай гордасцю агітатар Беганскі. — Але гэтага мала: я дабіваюся, каб у мяне ўсе рабочыя сталі агітатарамі.

Тав. Беганскі выхоўвае новых агітатараў з сваёй брыгады. Ён можа ўжо гардзіцца Тамашэўскім, Цеізікім і другімі, якія яму дапамагаюць у яго пачэснай справе.

Многа выдатных агітатараў ёсць на заводзе. Гэта — комуністы: Скрабататы, Шломін, Мінько, комсамольцы: Кронгаус і Рахельскі; беспартыйныя актывісты: Монтурэвіч, Трунін, Кучынскі, Канаплін, Юхневіч, Балюк, Бабяж, Мінкевіч і многія іншыя.

65 чалавек агітатараў ёсць на заводзе. Усе яны аб'яднаны ў агітказлектывы, якімі кіруе прапагандыст Лапскага завода комуніст Васілій Тупікін. Большасць з агітатараў праводзяць сваю работу на польскай мове. Два разы ў месяц тав. Тупікін праводзіць семінар з агітатарамі. На апошнім трохдзённым семінары агітатары завода без адрыву ад вытворчасці праслухалі рад цікавых лекцый аб Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, аб апошніх Указах урада, лекцыі аб Сталінскай Канстытуцыі і выбарчым законе. Агітатары дзяліліся вопытам сваёй агітацыйна-палітычнай работы, падкрэслівалі ўсё каштоўнае ў сваёй рабоце.

Тав. Тупікін штодзённа кансультыруе агітатараў. Яны прыходзяць да яго ў парткабінет за парадай, за літаратурай, ён дапамагае ім у складанні плана гутаркі, падбірае неабходны газетны матэрыял.

Заслугоўвае ўвагі пастаноўка ўчоту агітмасавай работы. Штодзённа агітатары прыходзяць у чытальню парткабінета і запісваюць у спецыяльную кнігу асноўнае з сваёй праведзенай гутаркі: тэму, заданыя пытанні, адказы на іх і т. д.

Выключна вялікая арганізуючая роля партыйнай арганізацыі ў агітацыі. Агітацыя стала арганічнай часткай усёй партыйнай работы.

Вялікая і пачэсная роля агітатараў у выбарчай кампаніі. Яны заклікаць забяспечыць перамогу блока комуністаў і беспартыйных у прадстаячых выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных. Няма сумнення, што агітатары Лапскага паравоза-вагонарамонтнага завода з чэсцю справяцца з сваёй адказнай задачай.

Г. Голанд.

Непазнавальным стаў наш камбінат

Як хутка праходзяць дні! Здаецца, што яшчэ зусім нядаўна мы сустракалі нашу родную Чырвоную Армію, здаецца, што яшчэ зусім нядаўна закончыла сваю работу Народнае Сабранне Заходняй Беларусі, якое выканала волю народа і ўстанавіла на вызваленай зямлі савецкую ўладу. Але з таго часу ўжо мінуў год.

І вось зараз у дні, калі адзначаецца першая гадавіна з часу адкрыцця Народнага Сабрання, мне хочацца расказаць аб нашых поспехах.

Наш тэкстыльны камбінат № 1 за прайшоўшы год стаў непазнавальным. Устаноўлена многа новых машын. У прадзільным цэху, дзе працую я, адноўлены ўсе машыны і станкі. Наш цэх падобны зараз на сапраўдную фабрыку.

Ведаючы, што мы працуем на сябе, на сваю радзіму, мы прынялі ўсе меры, каб павысіць прадукцыйнасць працы. Шырока разгарнулі сацыялістычнае спаборніцтва за выкананне і перавыкананне вытворчых планаў. У ліку першых стаханаўцаў аказаўся і я. І гэтае званне трымаю моцна.

Цэх наш дае зараз прадукцыі ў два разы больш, чым раней.

31 год я з'яўляюся рабочым. На адным толькі камбінаце № 1 працую 20 год. І ніколі я не бачыў такога ўздыму на вытворчасці, як пры савецкай уладзе. Ніколі я не бачыў і не марыў аб такім радасным жыцці, як зараз, пры савецкай уладзе.

У маёй сям'і 8 душ. Раней мы працавалі толькі ў двух—я і жонка. Жылося цяжка. Цяпер у сям'і чатыры рабочых. Усе разам зарабляем больш тысячы рублёў. Жывём добра.

У былой панскай Польшчы мяне не лічылі за грамадзяніна. Пашпарта не выдавалі. Цяпер-жа я—роўнапраўны грамадзянін СССР, прымаю актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Рабочыя мяне выбралі профоргам цэха. І з гэтым даручэннем я спраўляюся.

Зараз мы ўключыліся ў работу па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных. Вывучаем выбарчы закон.

За ўсе нашы поспехі мы яшчэ раз выносім вялікае дзякуй нашай бальшавіцкай партыі, нашаму роднаму таварышу Сталіну.

Я. К. Атрашкевіч,
стаханавец прадзільнага цэха 1-га беластоцкага тэкстыльнага камбіната.

Сапраўдныя гаспадары

Каля ракі Нёман раскінуліся палі соўгаса «Свіслач». У недалёкім мінулым гэтыя землі належалі панам, на якіх вякамі гнулі свае спіны сяляне. Пачуўшы аб прыходзе Чырвонай Арміі, батракі і беднякі навакольных вёсак расправіліся з сваімі эксплаататарамі. Зямля і ўсё дабро стала народным здабыткам.

Праводзячы ў жыццё наказ Народнага Сабрання, на вызваленых землях быў створан соўгас. У сваім распараджэнні соўгас мае 800 гектараў зямлі, 113 коней, 124 каровы, 121 свінню, 52 авечкі. Вясной бягучага года нам дзяржава прыслала тры трактары, дзве аўтамашыны, камбайн і іншы сельскагаспадарчы інвентар.

120 чалавек рабочых і служачых соўгаса, былыя батракі і сяляне беднякі, працуюць цяпер на сябе, на сваю краіну.

Уключыўшыся ў сацыялістычнае спаборніцтва імені XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і рыхтуючыся дастойна адзначыць выбарчую кампанію, калектыў соўгаса да свята паспяхова заканчвае ўсе сельскагаспадарчыя работы.

Брыгады рабочых на палях выконваюць і перавыконваюць свае нормы. Тт. Жук, Кулікоўская, Міхальчук і іншыя штодзённа выконваюць план на 150 процантаў. Трактарыст тав. Баярчанка дае дзве нормы.

Падрыхтавана цёплая і сытая зімоўка для жывёлы. Ацяплілі і пабялілі канюшню і кароўнік, заканчваецца будаўніцтва свінарніка.

Новым, культурным быццём жывуць былыя батракі. Па вечарах у выхадныя дні ў соўгасным клубе дэманстрыруюцца кінокарціны, моладзь наладжвае мастацкую самадзейнасць. Драматычны і харавы гурткі да свята рыхтуюць вялікую праграму.

У апошнія дні ў клубе праводзяцца гутаркі аб Сталінскай Канстытуцыі, рабочыя вывучаюць выбарчы закон.

Л. Малашонак,
дырэктар соўгаса «Свіслач», Гродненскага раёна.

Прадукцыйнасць завода павялічылася ў тры разы

У 1922-м годзе ў царскіх казармах гандляром Каганам быў арганізаван скурзавод, куды і я паступіў на работу. Але ў хуткім часе я вымушан быў пакінуць гэты завод. Звярнуўся я на яго толькі з прыходам Чырвонай Арміі.

Абліччa завода з прыходам Чырвонай Арміі пачала мяняцца. Гаспадарамі завода сталі рабочыя. Зараз тут будуюцца прасторныя, светлыя корпусы, мяняецца абсталяванне. На рэканструкцыю завода асігнаваш 1 мільён рублёў.

Не глядзячы на рэканструкцыйны перыяд, прадукцыйнасць завода вырасла ў тры разы. Калі раней ён даваў 5 мільёнаў дэцыметраў хрому ў год, то ў гэтым годзе датэрмінова да 1 снежня завод дасць 15 мільёнаў дэцыметраў. Лік рабочых завода павялічыўся ў два разы.

Уключыўшыся ў перадкастрычніцкае соцспаборніцтва, рабочыя паказваюць узоры стаханаўскай працы. За другую дэкаду кастрычніка аддзелачны цэх (майстар Цырульніцкі) выканаў праграму на 125 процантаў. Адмочна-зольны цэх (майстар Нохэль) выканаў сваё заданне на 133 проценты.

Х. Александровіч,
намеснік дырэктара гродненскага скурзавода №5.



Беласток сёння. Савецкая плошча пасля рэканструкцыі. Фота А. Сапіра.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЫБАРАЎ У МЯСЦОВЫЯ СОВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Комсамол—актыўны ўдзельнік перадвыбарчай кампаніі

З дня апублікавання Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб пачатку выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных свіслацкая комсамольская арганізацыя актыўна ўключылася ў велізарную палітычную работу.

На раённым сходзе комсамольскага актыва, прысвечаным вынікам XIV з'езда комсамола Беларусі, вялікая ўвага была звернута на падрыхтоўку і правядзенне выбараў.

Адбыліся таксама сходы пярвічных комсамольскіх арганізацый, на якіх дэтальна абмяркоўваліся пытанні, звязаныя з выбарамі. На гэтых сходах складзены планы перадвыбарчай агітацыйна-масавай работы і расстаўлены ўсе комсамольцы на рашаючыя ўчасткі работы. За кожным комсамольцам замацавана па 10—12 двароў выбаршчыкаў, дзе яны праводзяць вывучэнне Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона. Акрамя гэтага пры кожнай арганізацыі створаны гурткі комсамольцаў і моладзі па вывучэнню Канстытуцыі БССР і Палажэння аб выбарах.

Па пытанню выбараў праведзены сходы комсамольскай моладзі і гутаркі сярод школьнікаў раёна аб падрыхтоўцы дзіцячай мастацкай самадзейнасці для абслугоўвання выбарчых участкаў у час выбараў. З ліку лепшых комсамольцаў вылучана 10 чалавек старшынямі ўчастковых выбарчых камісій. Намеснікамі ўчастковых і акруговых камісій па выбарах у абласны і раённы Советы вылучана 32 чалавекі, старшынямі акруговых камісій па выбарах у раённы і сельскія Советы—43 чалавекі. Для работы агітатарамі падабрана 39 комсамольцаў і несаюзнай моладзі. Сярод вылучаных для ўдзелу ў падрыхтоўцы да выбараў больш 10 дзяўчат.

Комсамольцы-агітатары і члены выбарчых камісій з вялікім натхненнем узяліся за работу. Няма сумнення, што комсамол раёна з чэсцю справіцца з вялікай пачотнай работай і пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна забяспечыць на выбарах перамогу блока комуністаў і беспартыйных.

С. Кароль,
сакратар Свіслацкага райкома комсамола.

Раённая нарада партыйна-комсамольскага актыва

Граеўскі райком партыі правёў раённую нараду партыйна-комсамольскага актыва. Удзельнікі нарады абмеркавалі даклад сакратара райкома КП(б)Б тав. Маркоўскага аб задачах комуністаў і комсамольцаў у падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Дакладчык падрабязна расказаў аб тых мерапрыемствах, якія неабходна ажыццявіць у раёне.

У раённы, пасялковыя і сельскія Советы прадстаіць выбраць каля 500 чалавек. Па выбарах у абласны Совет створана 4 акругі, па выбарах у раённы Совет—50 акруг і па выбарах у сельскія і пасялковыя Советы—больш 400 акруг.

Такі размах выбарчай кампаніі абавязвае актыў раёна разгарнуць вялікую масава-палітычную работу.

На месцах праведзены сходы і мітынгі. Усюды прыняты рэзалюцыі, у якіх працоўныя адобрылі Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб назначэнні дня выбараў. На наступных сходах вылучаны прадстаўнікі ад рабочых, служачых і сялян у выбарчыя камісіі. Рабочыя граеўскай гумава-цясёмачнай фабрыкі вылучылі ў састаў акруговай камісіі па выбарах у абласны Совет майстра цэха тав. Навеліуса, сяляне вёскі Скае, Шчучынскага сельсовета, вылучылі ў сельскую выбарчую камісію лепшую актывістку—члена сельсовета тав. Я. Богдан, сяляне вёскі Мечы вылучылі ў састаў сельскай камісіі лепшага агітатара вёскі тав. С. Чэхоцкага.

З кожным днём усё шырэй разгортваецца агітацыйна-масавая работа. На выбарчых участках у вёсках больш 200 агітатараў пачалі работу па растлумачэнню сярод сялян выбарчага закона.

У якасці агітатараў і членаў выбарчых камісій па раёну будуць працаваць звыш двух тысяч чалавек.

На нарадзе ўскрыты і недахопы ў арганізацыйнай рабоце. Зусім недастатковую колькасць мы маем выдання Палажэння аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Адсутнічае пакуль што Палажэнне на польскай мове.

Выступаючыя на нарадзе ў спрэчках абмяняліся сваім першым вопытам агітацыйна-масавай работы і ўнеслі рад канкрэтных прапаноў для лепшага правядзення выбарчай кампаніі.

Б. Плаўнік,
загадчык оргінструктарскім аддзелам Граеўскага райкома КП(б)Б.

ВЫТВОРЧЫМІ ПАДАРУНКАМІ РАДЗІМЕ СУСТРЭНЕМ XXIII ГАДАВІНУ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

Вытворчы ўздым

У Ломжынскім раёне шырока разгарнулася перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу XXIII гадавіны Вялікага Кастрычніка. З кожным днём прадпрыемствы горада павышаюць тэмпы сваёй работы, шырацца рады стаханаўцаў.

Калектыў ватнай фабрыкі ўзяў на сябе абавязацельства выпусціць 30 тон ваты замест 25,8 тон па плану, на 15 дзён раней тэрміну закончыць праграму IV квартала, выпуск нізкіх сартоў прадукцыі давесці да 2-х процантаў замест 4,2 процанта.

Рабочыя актыўна змагаюцца за ажыццяўленне ўзятых абавязацельстваў. Работніца-двухстаночніца тав. Шкляжэвіч за змену выпускае 50—51 кілограм ваты замест 25 кілограмаў па норме. Яе прыкладу следуе работніца фабрыкі тав. Дабравольская, якая дае па дзве нормы. Значна павысілі прадукцыйнасць працы работніцы тав. Філінкоўская, Тарыцінская, Ізраілева і іншыя.

У чэсць прадстаячага свята рабочыя цагельнага завода № 4 абавязаліся датэрмінова выканаць гадавую вытворчую праграму, даўшы краіне мільён штук цэглы звыш плана. Сваё абавязацельства цагельшчыкі выконваюць. Перадавыя брыгады тт. Юркоўскага і Райта перавыконваюць нормы выпрацоўкі на 60—70 процантаў. Выдатных паказчыкаў дабіліся рабочыя гэтых брыгад тт. Віткоўскі і Градоўскі, якія выконваюць заданне на 165—170 процантаў.

Новымі вытворчымі поспехамі абавязаліся сустрэць слаўную гадавіну рабочыя завода сельскагаспадарчых машын.

Па раёну хутка будуць закончаны сельскагаспадарчыя работы. План азімага севу і падняцця зябліва закончан яшчэ 15 кастрычніка. План хлебаздачы па раёну выканан на 96 процантаў. Горш абстаіць справа з здачай бульбы дзяржаве. Здана ўсяго 81 процант да плана.

П. Грышчанка.

Выконваюць абавязацельствы

Калектыў прадзільна-ткацкай фабрыкі № 11 параўнаўча маладкі — тут працуе звыш 100 чалавек. Сярод рабочых фабрыкі прыкметна ўзрасла і разгарнулася вытворчая актыўнасць у сувязі з падрыхтоўкай да гадавіны Вялікага Кастрычніка.

Да 7 лістапада калектыў абавязаўся выканаць гадавы план. І цяпер ужо ёсць плады разгарнуўшагася перадкастрычніцкага соцыялістычнага спаборніцтва. На 24 кастрычніка гадавы план па прадзенню выканан на 109,7 процанта, па ткацтву — на 95,9 процанта. Праз некалькі дзён і па ткацтву будзе закончан гадавы план.

Гэтых поспехаў калектыў дабіўся упорнай стаханаўскай працай. Штодзённа фабрыка значна перавыкрывае свае вытворчыя заданні. Вось характэрныя лічбы выканання плана. 23 кастрычніка выкананне плана па апаратах складала 116 процантаў. У гэты-ж дзень прадзільшчыцы выканалі план на 130 процантаў. Перавыканалі план і ткачы. Лепшых паказчыкаў у сваёй рабоце дабіліся перадавыя людзі соцыялістычнай вытворчасці — стаханаўцы. Ткач-двухстаночнік І. Заблаў штодзённа выконвае сваю норму выпрацоўкі на 110—111 процантаў, М. Гінеля — на 108—109 процантаў. Добра працуе таксама пяцідзесяцігадовы ткач-двухстаночнік З. Рачкоўскі.

Усе матальшчыцы на многа перакрываюць норму выпрацоўкі і перайшлі на ўшчыльненую зону абслугоўвання. Пры норме ў 12 верацён яны абслугоўваюць па 18 верацён.


Дзякуючы ўзорнай рабоце калектыў 11-й прадзільна-ткацкай фабрыкі з месяца ў месяц выконвае вытворчую праграму.



Сакратар партбюро шахты імені Комінтэрна (трэст Окцябр—Руда, г. Крывы Рог) С. Юдзін (справа) гутарыць з кандыдатамі ў члены ВКП(б) аб ролі комуністаў на вытворчасці.

Фота К. Інсарава. Фота ТАСС.

Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка



22 розных працэсы робіць парніковы камбайн сістэмы агранома В. С. Маргч'яна, выстаўлены на ўчастку павільёна агародніцтва. Камбайн робіць вентыляцыю парнікоў (адкрывае рамы).

Фота В. Малышэва. Фота-клішэ ТАСС.

Кожнаму калгасу—пладовы сад

Садоўніцтва—важнейшая галіна сельскай гаспадаркі. Асобныя калгасы Скідэльскага раёна па ініцыятыве комсамольцаў і моладзі арганізавалі пасадку пладовых дрэў. Ініцыятыва калгаснікаў калгаса імені Варашылава і імені Кірага, Скідэльскага раёна, падхоплена многімі калгасамі нашай вобласці.

Пры пасадцы садоў неабходна асаблівую ўвагу звярнуць на агратэхнічныя мерапрыемствы, бо ад іх залежыць рост і пладаноснасць садоў. Як падрыхтоўчая работа, так і пасадка павінны быць загадзя прадуманы і прадугледжаны праўленнямі калгасаў і аграномамі райза і МТС. Трэба скласці графік работы, улічыўшы ўсе падрыхтоўчыя работы і самую пасадку дрэў.

Асноўныя этапы асенняй пасадкі пладовых дрэў зводзяцца к наступнаму. Трэба асаблівую ўвагу звярнуць на выбар месца пад сад. Паверхня глебы павінна быць роўняя або з малым нахілам на поўдзень. Глебу трэба падбіраць суглінкавую або супяшчаную. Для пасадкі непрыгодны лёгкія пяскі і цяжкія гліны. Заляганне грунтовых вод павінна быць не менш 3 метраў. Трэба таксама ўлічыць наяўнасць абароны ад ветра з поўначы і захада. Глебу неабходна ўзараць і пабаранаваць. Пры пасадцы дрэў трэба захоўваць адлегласць дрэва ад дрэва 10×10 метраў, разбіўку рабіць квадратную.

Ямы для пасадкі дрэў трэба капаць 0,5 метра глыбінёй і 1,5 метра шырынёй. Ямы павінны быць круглыя, а сценкі—адвесныя. Пры капанні ям верхні пласт глебы трэба кідаць у адзін бок, а ніжні пласт, падглебны, на другі бок ямы. Пасля выкапкі ямы павінны праветрывацца на працягу 3—4 дзён.

Немалаважнае значэнне мае таксама падрыхтоўка колляў. Колле павінна быць круглае, два метры даўжынёй і 6—7 сантыметраў таўшчынёй. Завострываць колле толькі з аднаго канца і апаліць гэты канец на агні. Убіваць яго ў дно адкрытай ямы так, каб рады вышлі простымі ва ўсе бакі. Ямы засыпаць роўна з паверхняй глебы лепшай зямлёй, якая выкінута з ям, а таксама зямлёй верхняга пласта глебы.

Усе вышэй пералічаныя работы неабходна правесці за адзін — два тыдні да пасадкі дрэў. Перад пасадкай пашкоджаныя карэнні абразаюцца да здаровай тканкі. Дрэвы павінны быць пасаджаны ў ямкі з усходняга боку колляў, не глыбей чым сядзелі ў пітомніках, так, каб карнявая шыйка была на ўзроўні паверхні глебы. Зямлю пры засыпцы карэння трэба добра абтоптваць, пазбягаючы пры гэтым абрыву карэнняў.

Перад наступленнем замаразкаў трэба акучваць ствалы дрэў зямлёй на вышыню 30 сантыметраў і абвязаць ёлкай або саломай.

Ю. Готліб,
аграном Беластоцкага аблза.

Поспехі кнышынскіх калгасаў

Ва ўсіх трох калгасах Кнышынскага раёна (калгасы імені Першага мая, «Новае жыццё», «Свабодная праца») арганізаваны па дзве фермы: буйнай рагатай жывёлы і свінатаварнай. Калгасы абзаводзяцца аўцатаварнымі фермамі.

Паспяхова закончаны ўсе сельскагаспадарчыя работы і выкананы абавязкі перад сваёй дзяржавай. Калгасы дзейна рыхтуюцца да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. На сходзе выбаршчыкаў сельскагаспадарчай арцелі імені Першага мая калгасніца Аўгіння Відман, былая батрачка, сказала:

— Ад усёй душы дзякую роднаму ўраду, таварышу Сталіну за жыццё без памешчыкаў і капіталістаў.

М. Грыгор'еў.

Крытыка і бібліяграфія

„На варце“ - Філіпа ПЕСТРАКА

Беларуская літаратура ўзбагацілася яшчэ адной выдатнай кнігай. Дзяржаўнае выдавецтва БССР выпусціла ў свет зборнік вершаў вядомага заходне-беларускага паэта Філіпа Сямёнавіча Пестрака. Кніга прыгожа аформлена і змяшчае ў сябе партрэт аўтара, кароткі аўтабіяграфічны артыкул і 50 вершаў, размешчаных сямю раздзеламі.

Аўтабіяграфічны артыкул скупы на словы. Сапраўдная аўтабіяграфія Пестрака — у яго вершах, натхнёных песнях вялікага сэрца.

Філіп Сямёнавіч Пестрак нарадзіўся 27 лістапада 1903 года на беларускім Палессі, у вёсцы Сакаўцы, былога Косаўскага павета. Шэрае бязрадаснае дзяцінства правёў у беднай сялянскай сям'і. Скончыў пачатковую школу. А далей—годы бежанства, жыццё ў Самарскай губерні, зварот у 1921-м годзе на радзіму. Праца на лесапільным заводзе. Служба леснікам у купца-лесапрамыслоўца. Спроба ў 1924-м годзе ўцячы ў Совецкі Саюз.

«На граніцы мяне злавілі, —піша паэт,—і этапным парадкам прывялі да хаты, потым трымалі месяц пад арыштам. К таму часу я ўжо канчаткова прадумаў свой жыццёвы шлях і прышоў да вываду, што адзінае збавенне ад жудаснага жыцця, ад нечалавечых умоў існавання, ад гнёту і здзекаў — гэта актыўная барацьба супроць белапольскіх акупантаў. І я стаў на гэты шлях».

Філіп Пестрак, як ніхто з паэтаў, падвяргаўся праследванням за рэвалюцыйную комуністычную дзейнасць. Больш 11 год паэт правёў у сырых засценках гродзенскага, лукішскага, пружаньскага і іншых астрогаў.

«За ўдзел у комуністычнай дэманстрацыі ў Косаве ў 1927-м годзе я папаў пад следства і поўтара сядзеў у турме. Час вымушанай бяздзейнасці скарыстоўваю на літа-



ратурную работу, пішу вершы, чытаю. Вырваўшыся на волю, зноў працую ў падполлі. У 1929-м годзе зноў арышт, суд і пяць год турмы, якія і адбыў у Гродне. У 1933-м годзе, пасля пяці месяцаў на волі, зноў 6 год турмы. Толькі ўмовы жыцця ў турме значна пагоршыліся. Мне перасталі даваць нават паперу і чарніла і прышлося «пісаць» вершы без гэтых прылад, завучваць напамяць, каб запісаць іх пасля выхаду з турмы».

На адным з літаратурных вечароў Філіп Пестрак расказваў, як яго вершы пранікалі на волю. Яны пісаліся на тонкай, папяроснай паперы, зашываліся ў бялізну, іх выносілі таварышы, адсядзеўшыя свой тэрмін. Нямногія трапілі ў друк. Большасць вершаў толькі зараз убачылі свет. Выданы цяпер зборнік—першая кніга паэта.

Філіп Пестрак — пранікнёны лірык рэвалюцыйна-вызваленчай барацьбы працоўных Заходняй Беларусі. Вершы, змешчаныя ў зборніку, паражаюць чытача сваёй унутранай глыбінёй, прачутасцю кожнага радка, кожнага слова. Яны напісаны крывёй сэрца, іх рэвалюцыйная страснасць, выключная эмацыянальная насычанасць, іх унутраны агонь цалкам паглынаюць чытача. Гэта не простае хваляванне пры чытанні добрага верша. Вершы Пестрака ўваходзяць у нутро чытача, арганізуюць яго пачуцці, узбагачаюць іх.

Чытаючы зборнік, яскрава ўяўляеш вобраз чалавека, які ўвесь аддаўся справе барацьбы за вызваленне працоўных, а сваю паэзію разглядае як «меч прамяністы» супроць тых, «хто абуў жыццё нашае ў лапці», супроць «чорнакрывавай зграі». Гэта не проста бунтар. Гэта рэволюцыянер-большэвік, які ясна бачыць шляхі, які знайшоў мэту і сэнс жыцця ў барацьбе за вялікую ідэю. Лірычны герой Пестрака — прадстаўнік авангарда працоўных Заходняй Беларусі, непарыўна звязаны з народам, з роднай краінай, якая пітае яго жыватворчымі сокамі.

Кроўна звязаўшы сваё жыццё з ідэямі комунізма, Пестрак лавіў «шумы прызыўныя» з вольных берагоў СССР. У песні чырвонага фронта «На штурм», даўшы страшэнныя малюнкі белапольскага панавання ў роднай краіне, дзе «карныя атрады гойсаюць па краі», дзе на шыю працоўных «начапілі каты голаду пятлю», паэт заклікае агніста:

Гэй, шчыльней шарэнгі!
Глянь, над намі горда
Сцяг чырвоны вее з молатам-
сярпом,—
Дык удар ты штурмам, бухні, бунт народны,
За наш край Советаў —
полымем - агнём.

Пестрак глыбока ўпэўнен у перамозе, і гэта ўпэўненасць ні на мінуту не пакідае яго. І таму для яго не страшны ні тэрор, ні праследванні, ні адзінаццаць год турмы. «Мы не памрэм!» — вось асноўны матыў «астрожных» вершаў Пестрака. Нават у дэфензіве, пасля жудасных катаванняў, ён лічыць сябе пераможцам:

Непрызнаннем, цярпеннем я
ворага змог
З сваёй перамогай іду у астрог.

Адным з самых моцных вершаў у зборніку з'яўляецца «Развітанне». Паэт выходзіць на волю. Але яго душу абцяжарвае тое, што ў сырых лёхах застаўся яго дарагі, яго добры таварыш.

Міліярды праносяцца дум.
О, дайце мне сілы. Я сэрца
агнём
З грудзей сваіх вырву, на
меч насаджу,
І з паходняй крыкну: за мной!
Меч вышэй! Гэта сэрца гарыць,
хай палае!
Гэта з цемры —задухі ідуць
мільёны,
А полымя сэрца ім ноч
рассякае
Сірэны гудуць — гэта валяцца троны
І шлях зорны світання
ляжыць.
Адзіночка мае
чатыры сцяны—
Ці-ж можа змясціцца ў іх
сэрца-паходня?

Вершы Пестрака і былі вось гэтай паходняй, якая прабівала чорную ноч белапольскага панавання, клікала і вяла ў бой. Філіп Пестрак быў трыбунам рэвалюцыі.

Выключная палітычная завостранасць, партыйнасць верша радняць паэзію Пестрака з паэзіяй Маякоўскага. Тут мы маем не вонкавае падабенства, а арганічную сувязь. Гэту аналогію асабліва наглядна можна прасачыць у вершы «На фронце» і ў радзе іншых.

Філіп Пестрак — выдатны знаўца батрацка-бядняцкай беларускай вёскі, «кіпучай, роднай глушы», якая шуміць падпольшчыкай. У вершах, змешчаных у раздзеле «Ты збудзі мяне, маці, рана» ён даў незабыўныя зарысоўкі сялянскага жыцця. Па сакавітасці вобразаў, па глыбіні паказу сялянскай нядолі і сялянскага бунту гэтыя вершы стаяць у раду лепшых вершаў беларускай літаратуры.

Я сятоння на панскім полі
Даў касой маладзецкі мах,
І мілую свае мазолі
На сваіх маладых руках.
Бачыў пан, як вялі атаку
Сталлю звонкай за радам
рад,—
Прыдзе час — перацнем і
гарляку,
І той панскі падвойны карк.

Дыяментам у зборніку з'яўляецца невялічкі раздзел «Па яе слядах»—вершы, прысвечаныя жанчыне. З якім благародствам, з якім глыбокім лірызмам паказан вобраз любімай дзяўчыны, комсамолкі-падпольшчыцы, якая «з майго твара астрожную копаць змятае паглядам сваім». Пачуццё кахання падпарадкавана барацьбе. Любімая паэта — «змагарская шчырая, простая» — саратнік, таварыш па рэвалюцыйнай рабоце. Глыбока хваляючым, высокамастацкім з'яўляецца лепшы верш гэтага раздзела «Ціхі зрок».

Можа вораг нагой стопча
грудзі твае,
Як захоча зламаць нашай
моцы красу.
Я твой боль пераможны не
буду таіць—
Ціхім зорам на ростані
ўсё раскажу..
Як не верне цябе наш
крыўдзіцельны рок,
Не падслухаеш больш маіх
дум і знямог,
Мой задуманы, ціхі, засмучаны
зрок
Будзе кветкі збіраць па
слядах сваіх ног.

У Пестрака свая манера пісьма, уласны паэтычны голас. Яго вершы суровыя, як сурова само жыццё, апісанае ў іх. Таму на першы погляд яны здаюцца цяжкаватымі для ўспрыймання. Але варта глыбей уніккнуць у іх, і становіцца зразумелым, што форма вершаў Пестрака знаходзіцца ў поўнай адпаведнасці з іх зместам. Сапраўднага паэтычнага майстэрства дасягае паэт у вершы «Мы не памрэм»:

Дня няма — у лёху дня
няма —
Толькі ноч..
І мохам зацвеў твар,
І яму каменную, яму ярма
Мерыш крокам, як вошчупам:
Раз-два, раз-два...

У некаторых вершах Пестрака сустракаюцца мясцовыя дыялектызмы і штучна ўтвораныя словы, якія затрудняюць успрыйманне. Але ў асноўным мова Пестрака — мова народа, багатая, сакавітая, рэволюцыйна адточаная.

У асобе Філіпа Пестрака совецкая беларуская паэзія атрымала таленавітага народнага песняра — трыбуна. Совецкі чытач з вялікай зацікаўленасцю прачытае мужныя песні зборніка «На варце». А прачытаўшы, з нецярплівасцю будзе чакаць новы зборнік паэта, састаўлены з вершаў на новую тэматыку, з вершаў, напісаных пад праменнямі Крамлёўскага сузор'я.

Т. Лясовіч.

КАМЮНІКЕ

Аб арганізацыі адзінай Дунайскай Камісіі

У рэзультаце перагавораў, якія адбываліся ў апошні час паміж Урадам СССР і Германскім Урадам і са згоды Італьянскага Урада, было прызнана неабходным ліквідаваць як Міжнародную Дунайскую Камісію, так і Еўрапейскую Дунайскую Камісію, і замест гэтых Камісій утварыць Адзіную Дунайскую Камісію з прадстаўнікоў СССР, Германіі, Італіі, Румыніі, Балгарыі, Венгрыі, Славакіі і Югаславіі.

Адзіная Дунайская Камісія будзе заклікана рэгуліраваць пытанні суднаходства на ўсім працягу Дуная ад яго вусця да г. Браціславы (Славакія).

У адпаведнасці з дасягнутым па ўказанаму вышэй пытанню пагадненнем, 28 кастрычніка г. г. у г. Бухарэсце адкрываюцца перагаворы паміж экспертамі—прадстаўнікамі СССР, Германіі, Румыніі і Італіі па ўрэгуліраванню часовага міжнароднаправавога рэжыму на морскім Дунаі (ад яго вусця да г. Браіла).

Савецкі ўрад упаўнаважыў удзельнічаць у перагаворах у г. Бухарэсце ў якасці Галоўнага Эксперта з боку СССР Генеральнага Сакратара Народнага камісарыята замежных спраў т. Собалева А. А.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

БЕРЛІН, 26 кастрычніка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе, што ўчора германская авіяцыя бамбардыравала Лондан і важныя аб'екты ў паўднёва-ўсходняй Англіі. Ля ўсходняга і паўднёвага ўзбярэжжа Англіі ў рэзультаце паветранай бамбардыроўкі і артылерыйскага абстрэлу былі рассеяны тры караваны суднаў. Адно судно трэба лічыць загануўшым. Некалькі суднаў захавалася ў парту Дуўра, дзе іх зноў абстралялі германскія цяжкія батарэі.

Уночы германская авіяцыя паспяхова атакавала Лондан, Ліверпуль, Бірмінгам, партовыя збудаванні на заходнім і паўднёвым узбярэжжах Англіі і аэрадромы Цэнтральнай Англіі.

У ноч на 26 кастрычніка непрыяцельскія самалёты скінулі ў розных пунктах Германіі бомбы, якія амаль усе ўпалі ў полі.

25 кастрычніка было збіта 17 непрыяцельскіх знішчальнікаў. 9 германскіх самалётаў не вярнуліся.

Штотыднёвы германскі агляд ваенных дзеянняў

БЕРЛІН, 26 кастрычніка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае наступны агляд ваенных дзеянняў за тыдзень, складзены генералам Глейзе-Харстэнаў: За прайшоўшы тыдзень аперацыі германскіх узброеных сіл былі накіраваны выключна супроць Англіі. На раду з неаслабляючымися паветранымі атакамі, асабліва ўзмацнілася за гэты кароткі прамежутак часу германская контрблакада. З 18 па 24 кастрычніка патоплены непрыяцельскія судны агульным танажам у 448.200 рэгістравых брута-тон, з іх 415.200 рэгістравых брута-тон было патоплена падводнымі лодкамі і 33 тысячы рэгістравых брута-тон тарпеднымі катэрамі. Пры нападзе на адзін з англійскіх караванаў суднаў, які ішоў пад узмоцненым канвоем, было патоплена 26 суднаў і ў час атакі на другі караван, 17 суднаў. Загінуў таксама ўвесь груз, які складаўся з ваенных матэрыялаў і харчавання. Англія ўскладае надзею на канваіраванне суднаў у Атлантыцы, пасля таго як у рэзультаце паспяховых дзеянняў германскіх узброеных сіл яна страціла магчымасць падвозу тавараў з еўрапейскага кантынента.

У аглядзе падкрэсліваецца, што купленыя ў ЗША дорага каштуючыя эсмінцы, большая частка якіх перадана Англіі і ўжо ёю выкарыстоўваецца, былі пабудаваны ў канцы сусветнай вайны і адрозніваюцца недахопамі ў канструкцыі, слабым і ўстарэўшым узбраеннем і малай хуткасцю.

Значны ўрон непрыяцелю за прайшоўшы тыдзень прычыніла авіяцыя. Разбурана многа ваенных аб'ектаў і прадпрыемстваў ваеннагаспадарчага значэння. Знішчан вялікі лік самалётаў. Нарушана гаспадарчае жыццё краіны шляхам бесперапынных налётаў на чыгункі і чыгуначныя вузлы.

У Лондане на працягу сямі тыдняў палаюць буйныя пажары ў доках і на складах, якія цягнуцца на адлегласці ў 15 кілометраў па абодвух баках Тэмзы.

У мінулы тыдзень галоўны ўдар германскай авіяцыі быў зноў накіраван супроць Лондана. Аднагасова германскія самалёты працягвалі інтэнсіўную бамбардыроўку буйных прамысловых збудаванняў у Цэнтральнай Англіі. Асабліва моцна пацярпелі сталеліцейныя заводы Ліверпуля і Манчэстэра, большая частка якіх працавала на айчызным вугалі і рудзе. Не меншы ўрон прычынен цэнтрам ваеннай прамысловасці Англіі—Бірмінгаму і Кавентры, дзе сканцэнтраваны многалікія авіяцыйныя заводы. Падарвана забеспячэнне англійскай ваеннай прамысловасці.

АДКРЫЦЦЁ КАНФЕРЭНЦЫІ Ў ДЭЛІ

ЛОНДАН, 25 кастрычніка. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Рэйтэр, у Дэлі сёння адкрылася канферэнцыя ўсходняй групы англійскіх дамініёнаў і калоній. На канферэнцыі прысутнічае каля 100 прадстаўнікоў ад розных частак Брытанскай імперыі.

Адкрываючы канферэнцыю, віцэкароль Індыі Ліналітгоў зачытаў прывітальную тэлеграму Чэрчыля.

Паведамленне ТАСС

У японскіх газетах апублікавана паведамленне, што 26 кастрычніка павінна адбыцца сустрэча японскага пасла г. Татэкава з таварышам Сталіным.

ТАСС упаўнаважан заявіць, што гэта паведамленне не адпавядае сапраўднасці.

Да перагавораў паміж Францыяй і Германіяй

НЬЮ-ЙОРК. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Асошыэйтэд Прэс з Берна, французскі ўрад абмяркоўвае праект франка-германскага пагаднення на перыяд да ўстанаўлення канчатковага міру. Па гэтаму пагадненню Францыя прадастаўляе Германіі марскія базы Дакар Тулон, Касабланка, Бізерта і паветраныя базы ў Паўночнай Афрыцы і Сірыі. Абарона гэтых баз укладаецца на французскі флот, аднак немцы не будуць кантраліраваць французскі флот і Францыя не ўступіць у вайну супроць Англіі. Граніца неакупіраванай зоны адсоўваецца на поўнач і будзе праходзіць па рацэ Сене, што дасць французам магчымасць кантраліраваць частку Парыжа. Усе французскія ваеннапалонныя звальняюцца. Указваюць, што, не гледзячы на жаданне Лаваля дабіцца канчатковага ўрэгуліравання адносін з Германіяй, Петэн і іншыя члены кабінета адмовіліся весці вайну супроць Англіі, але згадзіліся заключыць часовае пагадненне, бо ў адваротным выпадку Германія акупіруе ўсю Францыю.

—о—

ГЕРМАНСКІЯ УМОВЫ МІРУ

ВІШЫ. (ТАСС).

Як заяўляюць некаторыя замежныя і французскія журналісты, германскія ўмовы міру, прапанаваныя Францыі, уключаюць перадачу немцам узбярэжжа Ла-Манша да Булоні, Ардэн, Эльзас-Латарынгіі і Марока. Акрамя таго, немцы патрабуюць перадаць італьянцам дэпартамент Марскіх Альп, уключаючы Ніцу, а таксама Корсіку і Туніс, а іспанцам — Пірэнеі. У кругах міністэрства замежных спраў гэтыя паведамленні не адмаўляюцца і не пацвярджаюцца. Зараз можна амаль пэўна сказаць, што немцы патрабуюць выкарыстання ў першую чаргу флота і французскіх рэсурсаў. Петэн не займае пэўнай пазіцыі і хістаецца.

—о—

НА ЧЫГУНЦЫ БІРМА—КІТАЙ

ЧУНЦЫН, 25 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Юнайтэд Прэс перадае наступную заяву прадстаўніка кітайскіх ваенных улад: Факт прыбыцця 23 кастрычніка з Ласіо ў Куньмін (правінцыя Юньнань) грузавых машын і ўход іх на другі дзень у Чунцын гаворыць аб тым, што японскія паветраныя бамбардыроўкі не разбурылі Бірманскую чыгунку і не адбіліся на транспарце. Першы караван грузавых машын прывёз боепрыпасы, бензін і электраабсталяванне. Зараз па чыгунцы правозіцца толькі ўзбраенне, медыкаменты і іншыя тавары, закупленыя ўрадам. Прыватны транспарт забаронен. Забарона на правоз прыватных тавараў будзе існаваць да 28 лістапада. Большасць вадзіцеляў машын састаіць з кітайцаў і некаторага ліку індусаў.

Вялікі поспех оперы „Энхе-Булат Батор“

На спектаклі прысутнічалі таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, А. А. Андрэеў, А. І. Мікаян, Л. П. Берыя, Г. М. Маленкоў, А. С. Шчэрбакоў.

25 кастрычніка бурат-мангольскі Дзяржаўны музыкальна-драматычны тэатр зноў паказаў першую нацыянальную оперу «Энхе-Булат Батор» («Энхе — стальны багатыр»), ужо атрымаўшую станоўчую ацэнку сталічнай грамадскасці. На гэты раз спектакль ішоў на сцэне Вялікага тэатра СССР. Партэр, ложы і балконы былі перапоўнены.

Народныя напевы, якія далі кампазітару нямала разнастайных музыкальных тэм, прагучэлі меладычна і выразна.

Велізарнае ўражанне пакінулі танцы, пастаўленыя балетмейстэрам І. А. Майсеевым. Асаблівы поспех меў танец воінаў у ханскім шатры, майстэрска выкананы маладымі артыстамі.

На сцэне Вялікага тэатра яшчэ эфектней чым у час спектакляў у яго філіяле выглядалі красачныя касцюмы і дэкаратыўнае афармленне пастаноўкі.

Таленавітыя артысты — сыны і дочкі бурат-мангольскага народа — Н. К. Пятрова, І. Н. Батурын, Б. М. Балдакоў і іншыя стварылі запамінаючыяся вобразы, якія сведчаць аб іх значных творчых поспехах.

Яркі, змястоўны спектакль, створаны драматургам народным артыстам Бурат-Мангольскай АССР Н. Г. Балдана, кампазітарам праф. М. П. Фраловым і пастаноўшчыкам І. М. Туманавым, паказвае, якой невычарпальнай крыніцай для стварэння мастацкіх твораў з'яўляецца скарбніца народнай творчасці. Вобразы бурат-мангольскага гераічнага эпасу «Шона-Батор» знайшлі сваё дастойнае ўвасабленне ў гэтым спектаклі.

Пастаноўка, як і ў папярэднія дні, мела вялікі поспех у гледачоў, якія выключна горача і сардэчна віталі яе ўдзельнікаў і аўтараў.

На спектаклі прысутнічалі таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, А. А. Андрэеў, А. І. Мікаян, Л. П. Берыя, Г. М. Маленкоў, А. С. Шчэрбакоў.

(ТАСС).

Дастойна сустрэць гадавіну Кастрычніка

Абаронныя арганізацыі—Асоавіяхім і Чырвоны крыж горада Ломжы і раёна рыхтуюцца дастойна сустрэць гадавіну Вялікага Кастрычніка.

На прадпрыемствах і ўстановах створана 43 пярвічных арганізацыі Асоавіяхіма, 15 арганізацый Чырвонага крыжа. Членствам АСО ахвачана 1650 чалавек і Чырвонага крыжа — 1300 чалавек. 230 чалавек здалі нормы на значок «Гатоў да процілаветранай і хімічнай абароны», створана 16 гурткоў Чырвонага крыжа.

Аднак агульны стан абароннай работы яшчэ не здавальняючы. Слаба вядзецца палітычна-выхаваўчая работа з членамі АСО і Чырвонага крыжа. Не ва ўсіх прадпрыемствах і ўстановах створаны пярвічныя арганізацыі. Асабліва слаба разгортваецца абаронная работа на вёсцы. Ваенная вучоба сярод насельніцтва не наладжана.

Раённы абаронны актыў на сваім сходзе ўзяў на сябе абавязацельства ліквідаваць існуючыя недахопы; заключаны соцдагаворы на дастойную сустрэчу гадавіны Кастрычніка.

П. Паўлзў.

—о—

Задачы калектываў мастацкай самадзейнасці

Пасля вызвалення ад панскага іга мастацкая самадзейнасць заходніх абласцей Беларусі атрымала вялікія магчымасці для свайго развіцця. Створаны сотні розных гурткоў, якія прарабілі за прайшоўшы год велізарную работу. Толькі ў кампаніі па выбарах дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР калектывы мастацкай самадзейнасці далі каля 900 канцэртаў, абслужыўшы сотні тысяч выбаршчыкаў.

Зараз перад калектывамі мастацкай самадзейнасці стаяць новыя пачотныя задачы — падрыхтоўка да святкавання XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі і абслугоўванне працоўных у пачаўшайся выбарчай кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы.

Абласны Дом народнай творчасці разаслаў ужо ўсім калектывам рэкамендацыйны спісак для рэпертуара. Сярод рэкамендуемых твораў, песні аб правадырах, песні грамадзянскай вайны, калгасныя песні на рускай, беларускай, польскай, яўрэйскай мовах.

Казка, народжаная рэчаіснасцю

(Пра кінофільм «Светлы шлях»)

Мы жывем у дзіводны час, у прыгожы час, калі наўкола нас адбываецца так многа чароўнага і дзіўнага. Жыццё, нанова створанае па найвышэйшаму ідэалу геніяў, пышнее ў квітнеючай нашай краіне.

І вось, калі глядзіш такі твор мастацтва, як новы кінофільм «Светлы шлях», — паўстае карціна праўдзіва-казачная, маляўніча-вясёлая, дзе з рэчаіснасці нараджаецца паэтычная фантазія, а светлая мара робіцца жыццёвым увасабленнем. У старых казках пра шчаслівыя царствы і каралеўствы, складзеных даўно паэтамі, людзі знаходзілі водгук сваіх летуценняў і затоеных мар, але гэтыя мары так і адляталі на празрыстых крылцах па чорным змроку няволі. Старадаўная Золушка, бяднейшая з сясцёр, стала прынцэсай, дзякуючы сваёй разумнасці, знатнасці і іншым выключным якасцям. Гэта ў казцы; а ці многа бедных дзяўчат у стары час знаходзілі сапраўднае шчасце?

У нас няма прынцэс і няма імкнення стаць да іх падобнымі, бо знатнасць і слава ў нас — разуменне больш важкае і благароднае. Але ёсць у нас многа-многа простых дзяўчат, здольных на вялікія, слаўныя справы, і іх разумныя стараннi ў сваёй працы прыносяць усенародную славу, чэсць гераінь, знатнасць і павагу ва ўсёй краіне.

Так і з маладой непісьменнай сялянскай дзяўчынай Таняй Марозавай. Няхай усё пачынаецца з старой казкі, і няхай Таня, у марах аб шчаслівай долі, спявае пра выбраную лёсам Золушку і, агорнутая рамантыкай прыгожай казкі, забываецца пра будзённую рэальнасць. Няхай мадам, якой яна паслугуе, злуецца на яе дзівацтвы, — Таня ўсё мацней адчувае пад нагамі дарогу да святла і радасці, яе наставілі на гэту дарогу простыя людзі працы.

Таня стала ткачыхай, гэта каштавала ёй вялікай працы, але яна набыла кваліфікацыю хутчэй за астатніх, бо яна прыклала больш старанняў. А калі параўнялася ва ўменні з таварышкамі, рамантыка стала штурхаць яе на нешта незвычайнае, на такую работу, якая даказала-б сама перавагу Тані перад астатнімі. Многа думак у дзяўчыны, многа клопатаў у маладой Тані, а ўсё пра тое, каб у рабоце сваёй дасягнуць, чаго ніхто не дасягаў. І дасягнула! Яна працуе ўжо не на адным станку, а на васьмі, і гэта прыводзіць у замяшанне старых майстраў. А калі яна стала патрабаваць для сваёй работы 150 ткацкіх станкоў, гэта навяло спалох на кансерватыўнага дырэктара. Але спаборніцтва рушыць яе далей, і яна здзіўляе ўсіх сваёй работай на 240 станках! Што гэта, — казка? Не, такая праўда нашага жыцця.

Гэта праўда, бо героі-ж — усе рэальныя совецкія людзі. І сакратар парткома Мар'я Сяргееўна Проніна, і інжынер Лебедзеў — гэта-ж тыпы простых людзей, і іх дзеянні — звычайная з'ява на нашых фабрыках.

Заслужаная артыстка рэспублікі Любоў Орлова ў гэтай дзівоснай карціне класічна пранесла вобраз простай сялянскай дзяўчыны да вяршыні чалавечага прызвання, якое можа ажыццяўляцца толькі ў нашай соцыялістычнай краіне. А артыст Е. В. Самойлаў сыграў ролю інжынера Лебедзева з той падкупляючай праўдзівасцю, якая заўсёды пераносіць нас з казачных высяў на светлы дол рэчаіснасці, дзе многа шчасця для людзей. Трэба ўсяляк пахваліць і астравумны сцэнарый В. Ардава, і рэжысёрскую віртуознасць заслужанага дзеяча мастацтваў ордэнаносца Гр. Александрава, і чароўныя песні кампазітара — ордэнаносца І. О. Дунаеўскага.

Фільм, дзякуючы высокаму майстэрству мастакоў, якія стварылі яго, робіць радаснае, прыемнае ўражанне, радуе лёгкасцю і мудрасцю.

І. Клінаў.

ПАПРАЎКА

У нумары 247 (316) нашай газеты за 24 кастрычніка ў артыкуле «Як партыя большэвікоў падрыхтавала Вялікую Кастрычніцкую Соцыялістычную рэвалюцыю» дапушчаны памылкі: у пачатку III раздзела ў другім радку надрукавана: «...4 (17) кастрычніка»... трэба чытаць: «... 4 (17) красавіка». У VIII раздзел гэтага артыкула, у чацвертым радку апошняга абзаца надрукавана: «... 9 (22) кастрычніка», трэба чытаць: «... 7 (20) кастрычніка».

Нам. адказнага рэдактара **Г. М. КУЗНЯЦОЎ.**

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ—83. Тыраж—10.000 экз. Друкарня Беластокдрук.